✓З **2 чэрвеня** ў зале беларускай літаратуры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі праходзіць выстава **«Цудадзейнасць жывога слова»**, прысвечаная 80-годдзю Вячаслава Рагойшы. Творчая дзейнасць Вячаслава Пятровіча такая разнастайная, што пералічыць усе яе сферы проста немагчыма. Гісторык і тэарэтык літаратуры, літаратурны крытык, вершазнаўца і перакладазнаўца, кампаратывіст, тэкстолаг і выдавец, архівіст і бібліёграф, аўтар прац па паэтыцы і паэт, стыліст і мемуарыст, краязнаўца, тэлевядучы... Усё жыццё Вячаслаў Пятровіч працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Пасля заканчэння ў 1963 годзе філалагічнага факультэта БДУ застаўся працаваць выкладчыкам беларускай літаратуры. Абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыі, заняў пасаду прафесара кафедры, а ў далейшым стаў яе загадчыкам. Асноўнымі напрамкамі навуковай дзейнасці даследчыка з'яўляюцца: гісторыя беларускай літаратуры, узаемасувязь беларускай, украінскай і польскай літаратур, тэксталогія. Рагойша даследуе паэтыку верша, пытанні тэорыі мастацкага перакладу, праблемы літаратурнага працэсу і інш. На сённяшні дзень Вячаслаў Пятровіч мае больш за 800 навуковых прац. Раздзелы экспазіцыі «На арбіце часу» і «Слова пра знаўцу слова» падрабязна раскрываюць навуковую і выкладчыцкую дзейнасць таленавітага літаратуразнаўца. Сярод прадстаўленай літаратуры – кнігі В. Рагойшы «Паэтыка Максіма Танка», «Мой Трыглаў», «Дзесяць саг пра Караткевіча», дапаможнікі для ВНУ «Беларускае вершаванне», «Асновы вершазнаўства», «Уводзіны ў літаратуразнаўства», неаднаразова перавыдадзены «Паэтычны слоўнік», энцыклапедычны даведнік «Верш. Паэзія», зборнік вершаў «Полюс цяп-

ла», кніга літаратурна-крытычных артыкулаў, эсэ, дыялогаў «І адгукнецца слова ў слове...», кніга перакладной паэзіі «Вочы ў вочы, мыслі ў мыслі» і шмат іншых.

Выстава працуе па 17 ліпеня.